**Татарэвіч М.А.**

# УЗАЕМАСУВЯЗЬ ПРЫРОДЫ І КУЛЬТУРЫ Ў ПЕРЫЯД СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСІ

Сучасная культура грунтуецца на дасягненні папярэдніх эпох, у прыватнасці асаблівае светаўспрыманне сфарміравалася ў першабытным грамадстве. Да пытанняў апошняга звярталіся шматлікія даследчыкі. Так найбольш важныя працы Э. Тайлара, Дж. Фрейзера, Л. Леві-Бруля, К. Леві-Строса і інш.

Фарміраванне культурных формаў, традыцый, абрадаў адбывалася з непасрэдным ўзаемадзеяннем чалавека і прыроды, гэту з'яву можна было назіраць і на тэрыторыі старажытнай Беларусі. У рамках дадзенага артыкула для нас цікава праца І.В. Грабянчука "Гісторыя Беларусі. Культура". У ёй адлюстроўваюцца найбольш істотныя рысы першабытнай культуры: сінкрэтызм, гамагеннасць, утылітарызм, магічны рытуалізм. Сінкрэтызм азначае, што ўсе віды і элементы першабытнай культуры існуюць ў цесным сінтэзе, у шчыльным узаемапераплящэнні. Адпаведна, толькі дастаткова ўмоўна можна казаць асобна пра выяўленчае мастацтва, музыку, танцы, спевы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і інш. Лічыцца, што людзі першабытнага грамадства жылі ў поўнай гармоніі з прыродай. Яны з’яўляліся часткай экалагічнай сістэмы, якую складала кармавая тэрыторыя племя.Тое, што першабытны чалавек не вылучаў сябе з навакольнага свету, вызначала яго ўспрыманне навакольнага свету і асаблівасці мыслення. Старажытныя людзі не валодалі логікай у сучасным разуменні гэтага слова, ім было чужым паняцце дакладнага аналізу прычын і наступстваў, а іх светапогляд быў просякнуты эмоцыямі, якія зацямнялі розум. Гамагеннасць або аднароднасць паказвае на тое, што першабытная культура працяглы час захоўвала амаль нязменным сваё ўнутраннае ядро была подобнай у розных рэгіёнах свету. Утылітарызм выяўляўся ў тым, што дадены тып найчастей быў арыентаваны на дасягненне практычнай карысці, індывідуальнай і калектыўнай выгоды людзей. Магічны рытуалізм быў заснаваны на рытуальных дзеяннях, магічна-міфалагічным успрыманні свету. У выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першабытная свядомасць нараджала міфы, якія павінны былі растлумачыць усе тое, што адбывалася навокал. Людзі пераносілі на акаляючы свет свае ўласцівасці і пачуцці, гэта значыць ачалавечвалі яго. Сам свет паўставаў як набор сімвалаў, дзе рэальнасць і вымасел перапляталіся настолькі, што ўсякая мяжа паміж імі часта растваралася ў свеце эмоцый [1,с.7]. Праблемам магіі ў першабытнай культуры значную ўвагу надаваў Дж.Фрейзер ў творы "Залатая Галіна". Беларускі культуролаг В.Р. Языковіч акцэнтуе ўвагу на наступных характарыстыках першабытнай культуры: павольныя тэмпы развіцця(гэта значыць пераважаюць традыцыйныя формы дзейнасці. Доўгі час назапашваюцца перадумовы нават нязначных культурных трансфармацый. Аднак адзначаюцца культурныя выбухі, да самых значных адносіцца неалітычная рэвалюцыя, якая прывяла да пераходу ад палявання і збіральніцтва да земляробства, прыручэнню жывёл, ганчарства); прынцып дуальнасці, які вызначаў сацыяльную структуру і ўзаемадзеянне ў архаічным калектыве(гэта значыць сацыяльныя адносіны арганізоўваюцца на аснове парнай адпаведнасці. Так, любая першабытная супольнасць абавязкова раздяляецца на дзве часткі з абавязковай унутранай экзагаміей, гэта значыць забаронай шлюбных адносін унутры кожнай з частак); прынцып забароны (табу) найважнейшы рэгулятар сацыяльных узаемадзеянняў(гэта значыць у першую чаргу забарона накладавалася на забойства супляменнікаў, членаў свайго роду або абшчыны); Гэтак жа трэба адзначыць што, даследчык Э.Зайкоўскі, улічваючы археалагічную перыядызацыю старажытнай Беларусі, размежаваў першабытную культуру на тры перыяды: духоўная культура каменнага (узровень развіцця дасягнуў такой ступені, калі ўзнікае патрэбнасць як у пэўных эстэтычных адчуваннях, так і ў поглядах, якія б давалі ўяўленне пра агульную карціну света і тлумачылі месца чалавека ў ім. Так узнікла першабытнае мастацтва і рэлігійныя вераванні), бронзавага (у светапоглядзе насельніцтва адбыліся досыць значныя зрухі, выкліканыя як зменамі ў гаспадарцы, так і прыходам новага насельніцтва. У выніку гэтага духоўная культура, захоўваючы многае з набыткаў каменнага веку, узбагацілася шэрагам новых рыс. Заняткі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

землязробствам прывялі да пашырэння культу сонца, паколькі ад гэтага свяціла залежалі прарастанне і рост раслін. Распаўсюджваліся таксама ўшанаванне дажджу і звязаных з ім навальніц і маланак) і жалезнага (разам з прагрэсам у матэрыяльнай культуры насельніцтва развівалася і ўдасканальвалася яго духоўная культура, міфалагічна-рэлігійныя ўяўленні, дэкаратыўна-прыкладное і музычнае мастацтва, зачаткі навуковых ведаў пра акаляючы свет. Міфалагічныя ўяўленні і першабытная рэлігія ў тагачасных умовах з'яўляліся важнымі чыннікамі не толькі ў спробах тлумачэнне сусвету, але і праз пасрэдніцтва гэтага – гарманізацыі адносін чалавека з прыродай і адносін паміж людзьмі, а таксама індыкатарам захавання этнічнай адметнасці) вякоў.

Неабходна адзначыць, што ў перыяд першабытнага грамадства духоўнае жыццё нашых далекіх продкаў не было замкнутым.Ужо тады адбывалася ўзаемнае ўзбагачэнне моў, што сведчыць аб сацыяльна-эканамічных і культурных перайманнях. Словамі, якія тычацца лясной і хатняй гаспадаркі, абменьваліся балты і славяне. Паняцці, якія звязаны з земляробчай працай і вайной, нярэдка рабіліся агульнымі з германскімі. Ад інда-іранскіх пляменаў(пазней скіфаў) перайшлі словы, звыклыя для жывелагадоўлі, элементы рэлегійных культаў, назвы багоў: Вій, Сварог, Сімаргл, Хорст. У народнай культуры беларусаў захаваліся некаторыя ўяўленні, характэрныя для мацярынска-радавога ладу. Многа старажытных рысаў у ”каравайным ” вясельным абрадзе. Значную ролю адыгрываюць жывелы – дзеючыя асобы фальклору: пярэвартні, буслы, мядзведзі. Вытокі геметрычных арнаментаў легка прасачыць няалітычнага посуду .

Такім чынам, немагчымасць растлумачыць прыродныя з'явы парадзіла веру людзей у надзвычайныя сілы прыроды. Чалавек верыў у існаванне душы, якая здольна жыць асобна ад цела нават і пасля смерці, такія вераванні называюць анімізмам ад лацінскага "душа"(Э. Тайлар). Вера чалавека ў духаў, што маглі ўсяляцца ў асобныя неадушаўленыя прадметы, атрымала назву "фетышызма". Фетыш –гэта прадмет, які будзе дапамагаць яго старажытнаму ўладальніку. Кожны род меў сваю свяшчэнную жывелу –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"татэма". Э.Зайкоўскі гаворыць "Пра існаванне ўжо ў старажытным каменным веку культа ваўка, гэтаму сведчаць выяўленыя на некаторых тэрыторыях яго рытуальныя пахаванні і экспанаванне ваўчыных чарапоў"[1,с.60]. Таксама, як паказваюць многія даследчыкі, татэмнай жывелай на Палессі быў мядзведзь, доказам гэтаму служыць свята Камаедзіца, якое і зараз святкуецца на тэрыторыі Беларусі напярэдадні Благавешчання. Вера ў звышнатуральную сувязь паміж людзьмі рода і якой-небудзь жывелай ці раслінай завецца татэмізм. Такімі былі адны з першых форм рэлігіі - веры чалавека ў надзвычайныя сілы. Яны ўвасобіліся ў шанаванні сонца, агню, пакланенні вужам, веры ў магічную сілу камянеў. Старажытныя людзі, якія верылі ў існаванне замагільнага жыцця, пакінулі пасля сябе курганы – пясчаныя насыпы на месцы пахавання памерлых родзічаў. Вераванні старажытных жыхароў Беларусі дайшлі да нас у міфах пра курганы-валатоўкі, дзе пахаваны асілкі, пра папараць-кветку і інш.

Разгледзеўшы погляды беларускіх навукоўцаў, наконт развіцця культуры ў перыяд старажытнай Беларусі, можна зрабіць вывад, што прырода і культура развівалася ў вельмі цесным узаемадзеянні, першабытныя людзі жылі жылі ў поўнай гармоніі з прыродай.

1. Грабянчук, І.В. Гісторыя Беларусі. Культура / І.В Грабянчук. – Мн. : БДЭУ, 2009. – 94с.

2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. Т.1. Старажытная Беларусь : Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / Рэдкал: М. Касцюк (гал.рэд.) і інш. – Мн. : “Экаперспектыва”, 2000. – 351 с.

3. Языкович, В.Р. Культурология / В.Р. Языкович. – Мн. : РИВШ, 2010. – 364с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ